Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!



РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ

ВЫДАННЕ
ЦК КП(б)Б

№ 2
СТУДЗЕНЬ 1937 г.

Інв. №953 Б.

ТАРЖАСТВО ЛЕНІНІЗМА

Прайшло трынаццаць год, як перастала біцца сэрца найвялікшага чалавека, настаўніка і правадыра працоўных усяго свету, геніяльнейшага арганізатара большэвіцкай партыі—Владзіміра Ільіча Леніна.

Ленін ушоў ад нас, але імя яго вечна будзе жыць у сэрцах працоўных нашай краіны, у сэрцах прыгнечаных усяго света.

Ленін выхаваў нашу партыю, мудрую, большэвіцкую партыю, узброеную ленінскім вучэннем.

Над магілай Ільіча вялікі Сталін ад імя ўсёй партыі большэвікоў даў клятву свята захоўваць ленінскія заветы і да канца іх выконваць, цвёрда ісці па таму шляху, які ўказаў В. І. Ленін.

У жорсткай барацьбе з класавым ворагам і яго агентурай унутры партыі і рабочага класа бліжэйшы друг і паплечнік вялікага Леніна—таварыш Сталін адстаяў чыстату вучэння Маркса—Энгельса—Леніна, развіў і ўзбагаціў гэта вучэнне, згуртаваў партыю пад непераможным сцягам ленінізма. Таварыш Сталін з гонарам пранёс і ўзняў на небывалую вышыню гэты сцяг, пад якім соцыялізм—мара ўсяго чалавецтва—канчаткова перамог у СССР.

Кожны год, у гэту сумную дату для ўсяго свету, у гадавіну смерці Леніна, мільёны будаўнікоў соцыялізма аглядваюцца на пройдзены шлях. І з кожным годам веліч Леніна выяўляецца ўсё ярчэй, усё грандыёзней, бо ў кожным поспеху нашай краіны, ва ўсіх нашых перамогах мы бачым, мы адчуваем геній нашага настаўніка Леніна.

Леніна сярод нас няма, але ажыццёўленае вучэнне яго непазнавальна змяніла твар краіны. Далёка ззаду засталася царская дарэволюцыйная Расія. Адсталая аграрная краіна ператварылася ў перадавую індустрыяльную дзяржаву.

Нашы прадпрыемствы даюць такую колькасць прадукцыі, якая высоўвае Совецкі Саюз на першае месца ў Еўропе і на другое месца ў свеце пасля Амерыкі.

З года ў год наша соцыялістычная прамысловасць перавыконвае планы. У 1936 годзе совецкая прамысловасць дала прадукцыі ў 8 разоў больш, чым давала ўся прамысловасць царскай Расіі ў 1913 годзе.

Перадавыя галіны прамысловасці рапартамі кароткіх лічб сказалі аб датэрміновым выкананні планаў 1936 года.

Чыгуначны транспарт штодзённа грузіў 86.160 вагонаў замест планавых 78.500 вагонаў.

Вядучыя галіны нашай народнай гаспадаркі (цяжкая прамысловасць, чыгуначны транспарт) выканалі на год раней другую пяцігодку!

У мінулым дробнасялянская краіна наша стала краінай самага буйнага ў свеце калектыўнага машынізаванага земляробства. Владзімір Ільіч вучыў, што шлях вызвалення працоўнага сялянства ад галечы, цемры, кулацкай кабалы ляжыць толькі праз аб'яднанне ў калгасы. Пад кіраўніцтвам мудрага Сталіна партыя вырашыла і гэту задачу.

Партыя на чале з геніяльным Сталіным канчатвова разграміла апошні эксплаататарскі клас—кулакоў у вёсцы. Калгасны лад перамог канчаткова і беспаваротна.

Гэта перамога прынесла дзесяткам мільёнаў калгаснікаў і калгасніц нашай краіны сапраўды культурнае і заможнае жыццё.

Ленін заўсёды падкрэсліваў вялікія здольнасці народных мас, вызваленых рэволюцыяй з-пад уціску капіталізма. І мы бачым, як цяпер у нас выраслі новыя людзі, новыя кадры.

На справе ажыццявіліся ў Совецкім Саюзе вялікія словы таварыша Леніна, што кожная кухарка павінна навучыцца кіраваць дзяржавай. Ва ўсіх галінах дзяржаўнага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва жанчына ўжо заваявала пачэснае месца.

Хуткімі тэмпамі растуць жаночыя кадры і ў соцыялістычнай сельскай гаспадарцы Совецкага Саюза. У калгасе жанчына атрымала поўнае равенства з мужчынай. Мы маем зараз каля 170 тысяч жанчын—члены праўленняў калгасаў, 200 тысяч брыгадзіраў паляводчых брыгад. Падрыхтавана 25 тысяч трактарыстак, тысячы камбайнерак і другіх вадзіцелей складаных сельскагаспадарчых машын. Звыш 300 тысяч жанчын — членаў сельсоветаў і 2500 жанчын—старшынь сельсоветаў.

Гэта лепш за ўсё гаворыць, чым стала совецкая жанчына.

Мільёны працоўных у нас паказалі, якая радасная праца ў краіне соцыялізма. У нас выявілася многа герояў, усім жыццём адданых сваёй цудоўнай радзіме. Іх тысячы, дзесяткі тысяч. Яны ўсюды: у прамысловасці, у сельскай гаспадарцы, у Чырвонай арміі, на транспарце, у флоце, авіяцыі, у навуцы.

Гэта людзі—стаханаўцы, якія аўладалі тэхнікай сваёй справы, асядлалі яе і пагналі ўперад. Яны дабіліся нябачаных у гісторыі паказчыкаў выкарыстання тэхнікі, падпарадкавання яе чалавеку.

...„Наша совецкае грамадства дабілася таго, што яно ўжо ажыццявіла ў асноўным соцыялізм, стварыла соцыялістычны лад, г. зн. ажыццявіла тое, што ў марксістаў называецца інакш першай ці ніжэйшай фазай комунізма. Значыць, у нас ужо ажыццёўлена ў асноўным першая фаза комунізма, соцыялізм". (Сталін).

Соцыялізм перамог у барацьбе з усімі ворагамі партыі—контррэволюцыйным трацкізмам, агіднымі зіноўеўска-каменеўскімі падонкамі, правымі апартуністамі, з нацыянал-контррэволюцыянерамі. Гэта была барацьба за перамогу ленінізма, за таржаство ленінізма.

Перамогшы соцыялізм падняў нашу краіну на такую вышыню, адкуль адкрыт шлях да канчатковай мэты—да комунізма.

І гэты шлях асветлен яркім светам Сталінскай Канстытуцыі, якую ўвесь 170-мільённы совецкі народ сустрэў з вялікім гонарам і таржаствам.

Сталінская Канстытуцыя—гэта вынік бліскучых перамог на адной шостай зямнога шара.

Сталінская Канстытуцыя—гэта яркі маяк для ўсяго прыгнечанага народу. Яна асвятляе шлях ўсяму чалавецтву, шлях вызвалення ад капіталістычнай кабалы. І па гэтаму шляху, па вялікім заветам Леніна вядзе працоўных усяго свету комуністычная партыя пад кіраўніцтвам мудрага Сталіна.

ПА ПОВАДУ СМЕРЦІ ЛЕНІНА

Прамова таварыша СТАЛІНА на II Усесаюзным з'ездзе Советаў 26 студзеня 1924 г.

Таварышы! Мы, комуністы, людзі асобага складу. Мы скроены з асобага матэрыялу. Мы—тыя, якія састаўляюць армію вялікага пролетарскага стратэга, армію тав. Леніна. Няма нічога вышэй, як чэсць належаць да гэтай арміі. Няма нічога вышэй, як званне члена партыі, аснавальнікам і кіраўніком якой з'яўляецца таварыш Ленін. Не ўсякаму дана быць членам такой партыі. Не ўсякаму дана вытрымаць нягоды і буры, звязаныя з членствам у такой партыі. Сыны рабочага класа, сыны нужды і барацьбы, сыны неймаверных нястач і гераічных намаганняў—вось хто, перш за ўсё, павінны быць членамі такой партыі. Вось чаму партыя ленінцаў, партыя комуністаў называецца разам з тым партыяй рабочага класа.

Уходзячы ад нас, таварыш Ленін завяшчаў нам трымаць высока і захоўваць у чыстаце вялікае званне члена партыі. Клянёмся табе, таварыш Ленін, што мы з чэсцю выканаем гэту тваю запаведзь!

25 гадоў пеставаў таварыш Ленін нашу партыю і выпеставаў яе, як самую моцную і самую загартаваную ў свеце рабочую партыю. Удары царызма і яго апрычнікаў, шаленства буржуазіі і памешчыкаў, узброеныя нападзенні Калчака і Дзянікіна, узброенае ўмяшанне Англіі і Францыі, хлусня і паклёп стовуснага буржуазнага друку,—усе гэтыя скарпіёны нязменна падалі на галаву нашай партыі на працягу чвэрці века. Але наша партыя стаяла, як уцёс, адбіваючы незлічоныя ўдары ворагаў і вядучы рабочы клас уперад, да перамогі. У лютых баях выкавала наша партыя адзінства і згуртаванасць сваіх радоў. Адзінствам і згуртаванасцю дабілася яна перамогі над ворагамі рабочага класа.

Уходзячы ад нас, таварыш Ленін завяшчаў нам захоўваць адзінства нашай партыі, як зяніцу вока. Клянёмся табе, таварыш Ленін, што мы з чэсцю выканаем і гэту тваю запаведзь!

Цяжкая і нязносная доля рабочага класа. Мучыцельны і цягасны пакуты працоўных. Рабы і рабаўладальнікі, прыгонныя і прыгоннікі, сяляне і памешчыкі, рабочыя і капіталісты, прыгнечаныя і прыгнятальнікі,—так будаваўся свет спакон вякоў, такім ён астаецца і цяпер у велізарнай большасці краін. Дзесяткі і сотні раз прабавалі працоўныя на працягу вякоў скінуць з плеч прыгнятальнікаў і стаць панамі свайго становішча. Але кожны раз, разбітыя і зганьбаваныя, вымушаны былі яны адступаць, тоячы ў душы крыўду і ўніжэнне, злабу і роспач і накіроўваючы ўзрокі на няведомае неба, дзе яны спадзяваліся знайсці збаўленне. Ланцугі рабства аставаліся некранутымі, або старыя ланцугі змяняліся новымі, такімі-ж цягаснымі і ўніжальнымі. Толькі ў нашай краіне ўдалося прыгнечаным і задаўленым масам працоўных скінуць з плеч панаванне памешчыкаў і капіталістаў і паставіць на яго месца панаванне

рабочых і сялян. Вы ведаеце, таварышы, і цяпер ўвесь свет прызнае гэта, што гэтай гіганцкай барацьбой кіраваў таварыш Ленін і яго партыя. Веліч Леніна ў тым, перш за ўсё, і састаіць, што ён, стварыўшы Рэспубліку Советаў, тым самым паказаў на справе прыгнечаным масам усяго свету, што надзея на збаўленне не страчана, што

панаванне памешчыкаў і капіталістаў недаўгавечна, што царства працы можна стварыць намаганнямі саміх працоўных, што царства працы трэба стварыць на зямлі, а не на небе. Гэтым ён запаліў сэрцы рабочых і сялян усяго свету надзеяй на вызваленне. Гэтым і аб'ясняецца той факт, што імя Леніна стала самым любімым іменем працоўных і эксплаатуемых мас.

Уходзячы ад нас, таварыш Ленін завяшчаў нам захоўваць і ўмацоўваць дыктатуру пролетарыята. Клянёмся табе, таварыш Ленін, што мы не пашкадуем сваіх сіл для таго, каб выканаць з чэсцю і гэту тваю запаведзь!

Дыктатура пролетарыята стварылася ў нашай краіне на аснове саюза рабочых і сялян. Гэта першая і карэнная аснова Рэспублікі Советаў. Рабочыя і сяляне не маглі-б перамагчы капіталістаў і памешчыкаў без наяўнасці такога саюза. Рабочыя не маглі-б разбіць капіталістаў без падтрымання сялян. Сяляне не маглі-б разбіць памешчыкаў без кіраўніцтва з боку рабочых. Аб гэтым гаворыць уся гісторыя грамадзянскай вайны ў нашай краіне. Але барацьба за ўмацаванне Рэспублікі Советаў далёка яшчэ не закончана,—яна набыла толькі новую форму. Раней саюз рабочых і сялян меў форму ваеннага саюза, бо ён быў накіраван супроць Калчака і Дзенікіна. Цяпер саюз рабочых і сялян павінен прыняць форму гаспадарчага супрацоўніцтва паміж горадам і вёскай, паміж рабочымі і сялянамі, бо ён накіраван супроць купца і кулака, бо ён мае сваёй мэтай узаемнае снабжэнне сялян і рабочых усім неабходным. Вы ведаеце, што ніхто так настойліва не праводзіў гэту задачу, як таварыш Ленін.

Уходзячы ад нас, таварыш Ленін завяшчаў нам умацоўваць усімі сіламі саюз рабочых і сялян. Клянёмся табе, таварыш Ленін, што мы з чэсцю выканаем і гэту тваю запаведзь!

Другой асновай Рэспублікі Советаў з'яўляецца саюз працоўных нацыянальнасцей нашай краіны. Рускія і украінцы, башкіры і беларусы, грузіны. і азербайджанцы, армяны і дагестанцы, татары і кіргізы, узбекі і туркмены—усе яны аднолькава зацікаўлены ва ўмацаванні дыктатуры пролетарыята. Не толькі дыктатура пролетарыята выратоўвае гэтыя народы ад ланцугоў і прыгнечання, але і гэтыя народы выратоўваюць нашу Рэспубліку Советаў ад козней і вылазак ворагаў рабочага класа сваёй беззаветнай адданасцю Рэспубліцы Советаў, сваёй гатоўнасцю афяроўваць за яе. Вось чаму таварыш Ленін няспынна гаварыў нам аб неабходнасці добраахвотнага саюза народаў нашай краіны, аб неабходнасці брацкага іх супрацоўніцтва ў рамках Саюза Рэспублік.

Уходзячы ад нас, таварыш Ленін завяшчаў нам умацоўваць і расшыраць Саюз Рэспублік. Клянёмся табе, таварыш Ленін, што мы выканаем з чэсцю і гэту тваю запаведзь!

Трэцяй асновай дыктатуры пролетарыята з'яўляецца наша Чырвоная армія, наш Чырвоны флот. Ленін не раз гаварыў нам, што перадышка, адваяваная намі ў капіталістычных дзяржаў, можа аказацца кароткачасовай. Ленін не раз ўказваў нам, што ўмацаванне Чырвонай арміі і паляпшэнне яе стану з'яўляецца адной з важнейшых задач нашай партыі. Падзеі, звязаныя з ультыматумам Керзана і з крызісам у Германіі, лішні раз пацвердзілі, што Ленін быў, як і заўсёды праў. Паклянёмся-ж, таварышы што мы не пашкадуем сіл для таго, каб умацаваць нашу Чырвоную армію, наш Чырвоны флот.

Грамадным уцёсам стаіць наша краіна, акружаная акіянам буржуазных дзяржаў. Хвалі за хвалямі коцяцца на яе, пагражаючы затапіць і размыць. А ўцёс усё трымаецца непахісна. У чым яе сіла? Не толькі ў тым, што краіна наша трымаецца на саюзе рабочых і сялян, што яна ўвасабляе саюз свабодных нацыянальнасцей, што яе абараняе магутная рука Чырвонай арміі і Чырвонага флота. Сіла нашай краіны, яе моцнасць, яе трываласць састаіць у тым, што яна мае глыбокае спачуванне і нерушымае падтрыманне ў сэрцах рабочых і сялян усяго свету. Рабочыя і сяляне ўсяго свету хочуць захаваць Рэспубліку Советаў, як стралу, пушчаную вернай рукой таварыша Леніна ў стан ворагаў, як апору сваіх надзей на выратаванне ад гнёту і эксплаатацыі, як верны маяк, які ўказвае ім шлях вызвалення. Яны хочуць яе захаваць і яны не дадуць яе разбурыць памешчыкам і капіталістам. У гэтым наша сіла, у гэтым сіла працоўных усіх краін. У гэтым-жа слабасць буржуазіі ўсяго свету.

Ленін ніколі не глядзеў на Рэспубліку Советаў, як на самамэту. Ён заўсёды разглядаў яе, як неабходнае звяно для ўзмацнення рэволюцыйнага руху ў краінах Захада і Усхода, як неабходнае звяно для аблягчэння перамогі працоўных усяго свету над капіталам. Ленін ведаў, што толькі такое разуменне з'яўляецца правільным не толькі з пункту гледжання міжнароднага, але і з пункту гледжання захавання самой Рэспублікі Советаў. Ленін ведаў, што толькі такім шляхам можна запаліць сэрцы працоўных усяго свету к рашучым баям за вызваленне. Вось чаму ён, геніяльнейшы згеніяльных правадыроў пролетарыята, на другі-ж дзень пасля пролетарскай дыктатуры заклаў фундамент інтэрнацыянала рабочых. Вось чаму ён нястомна расшыраў і ўмацоўваў саюз працоўных усяго свету—Комуністычны Інтэрнацыянал.

Мы бачылі за гэтыя дні паломніцтва да гроба таварыша Леніна дзесяткаў і соцень тысяч працоўных. Праз некаторы час і вы ўбачыце паломніцтва прадстаўнікоў мільёнаў працоўных да магілы таварыша Леніна. Можаце не сумнявацца ў тым, што за прадстаўнікамі мільёнаў пацягнуцца потым прадстаўнікі дзесяткаў і соцень мільёнаў з усіх канцоў свету для таго, каб засведчыць, што Ленін быў правадыром не толькі рускага пролетарыята, не толькі еўрапейскіх рабочых, не толькі каланіяльнага Усхода, але і ўсяго працоўнага свету земнага шара.

Уходзячы ад нас, таварыш Ленін завяшчаў нам вернасць прынцыпам Комуністычнага Інтэрнацыянала. Клянёмся табе, таварыш Ленін, што мы не пашкадуем свайго жыцця для таго, каб умацоўваць і расшыраць саюз працоўных усяго свету—Комуністычны Інтэрнацыянал!

Высокая ўзнагарода

Паліна Грыгорауна Фельд.

Бацька і брат у Чырвонай гвардыі. Разам з усёй краінай яны змагаліся за новае жыццё. Хваля гераізма і адвагі падняла мільёны.

Гэта быў незабыўны 1918 год. Я не ўмела страляць, я і не спадзявалася авалодаць кулямётам, але маладое сэрца дыктавала мне, што і я—пятнаццацігадовая дзяўчынка—магу дапамагчы гераічнаму народу ў яго барацьбе, поўнай вялікага энтузіязма і прагнасці свабоды.

І я разам яшчэ з адной жанчынай прышла ў часць:

— Мы ўмеем мыць бялізну, латаць вопратку і іграць на сцэне,—заявілі мы камандзіру.

І мы мылі бялізну байцоў, мы латалі вопратку іх, мы выклікалі бурныя апладысменты выступленнямі новага чырвонаармейскага драматычнага гуртка.

З таго часу маё жыццё звязана з нашай Чырвонай арміяй. Тут я вышла замуж, тут я нарадзіла сына. Разам з мужам я пераязджала з адной часці ў другую, з аднаго горада ў другі. І ўсюды я арганізоўвала харавыя і фізкультурныя гурткі, усюды старалася як мага шырэй разгарнуць чырвонаармейскую мастацкую самадзейнасць.

У гэтую справу я ўцягвала жонак камандзіраў. У Варонежы я была выбрана старшынёй жанбюро пры Доме Чырвонай арміі. Праз некаторы час у Калузе мяне выбралі дэпутатам горсовета, і я стала весці барацьбу за культурнае грамадскае харчаванне, за чыстату і ўтульнасць на нашых прадпрыемствах.

За гэта я была паслана на Першую ўсеармейскую нараду жонак камандзіраў і начальніцкага складу РСЧА.

З таго часу я стала працаваць з яшчэ большым захапленнем. Я адчувала, што работа жонак камандзіраў і начальніцкага складу прыносіць сапраўдную карысць.

Прайшло шэсць год. За гэтыя гады мяне выбіралі ў горсовет па месцу службы майго мужа. Цяпер я член горсовета ў Барысаве.

Работа жанчын нашага Саюза афарбавалася ў новыя колеры.

Мы імкнемся да высокай культуры, вартай людзей вялікай эпохі соцыялізма. Мы рыхтуемся разам з нашымі мужамі, братамі, сынамі стаць на абарону нашай цудоўнай радзімы, калі вораг пасмее пасягнуць на наша радаснае жыццё.

Разам з усімі дзяўчатамі і жанчынамі нашай краіны я працую над узняццем свайго ідэйна-палітычнага і культурнага ўзроўню, разам з усімі дачкамі нашай бацькаўшчыны вучуся вайсковай справе.

Я здала нормы на значкі ГПА, ГСА, ПВХА, „Варашылаўскі стралок“ і „Варашылаўскі кавалерыст“. Я рыхтую жонак камандзіраў да здачы гэтых норм.

Выключную ўвагу аказваем мы—жонкі камандзіраў—развіццю нашай мастацкай самадзейнасці. Цяпер наша жаночая капэла выконвае ўрыўкі з опер. Мы ўзбагацілі свой рэпертуар класічнымі творамі, і ўсё больш і больш культывіруем пастаноўку народных песень і танцаў. Займаемся мы і фізкультурай, і акрабатыкай.

Вялікую работу правялі мы, каб стварыць утульнасць у чырвонаармейскіх інтэрнатах і ў ленінскіх кутках. Акрамя таго мы—жонкі кіруем нашымі дзіцячымі ўстановамі.

Цяжка перадаць, якой радасцю напоўнілася маё сэрца, калі мяне выбралі дэлегатам на Ўсесаюзную нараду жонак камандзіраў і начальніцкага складу РСЧА. Я так марыла ўбачыць таварыша Сталіна, роднага, любімага! І мая мара збылася. Ён—тварэц вялікай Канстытуцыі, якая напісана яго рукой, прышоў да нас у гэтую залу, дзе так нядаўна быў зацверджан вялікі кодэкс заваёў соцыялізма—Сталінская Канстытуцыя.

Зала лікавала, зала пела. Нельга было спыніць гэты струмень бурлівай радасці совецкай жанчыны.

І ўвесь час над нашай нарадай лунала яго ўсмешка, усмешка самага мудрага, самага роднага чалавека, усмешка вялікага Сталіна.

Партыя і ўрад высока ацанілі скромныя справы жонак камандзіраў і начальніцкага складу РСЧА. У Маскве нас акружылі цеплынёй і клопатамі. Некаторыя з нас атрымалі вышэйшую ўзнагароду—ордэны. З таго часу і на маёй грудзі зззяе ордэн—„Знак почета“.

І цяпер я буду працаваць яшчэ лепш, яшчэ адданей, працаваць так, як вучыў нас вялікі настаўнік Владзімір Ільіч, працаваць так, як вучыць нас мудры наш друг таварыш Сталін, працаваць так каб заслужыць пахвалу першага маршала Совецкага Саюза Наркома абароны тав. Варашылава.

Паліна Грыгораўна Фельд—жонка палітрука Н-скай часці.

Выконваем запаветы Леніна

У нас на фабрыцы, як і па ўсяму неабдымнаму Совецкаму Саюзу, вялікія ленінскія заветы аб выхаванні жанчын штодзённа ператвараюцца ў жыццё.

З сямі цэхавых парторгаў на фабрыцы — чатыры жанчыны: тт. Гурыновіч, Меламед, Фрэйнклах і Рыер. Мы маем яшчэ многа жанчын, вылучаных парторгамі брыгад, профоргамі цэхаў, рэдактарамі штодзёнак.

Цяпер, калі ў нашай краіне дзейнічае самая дэмакратычная ў свеце Канстытуцыя, большэвіцкая агітацыя паднята яшчэ на большую вышыню. На гэтым участку жанчыны нашай фабрыкі аказаліся ў ліку перадавых. Жанчын—агітатараў у нас 15 чалавек. Таварышы Венгерко, Кузнец, Брэгман, Кацовіч і іншыя штодзённа ў сваіх брыгадах праводзяць паліт-масавую работу, знаёмяць рабочых цэха з пытаннямі міжнароднага характара. Гурткамі па гісторыі партыі кіруюць у нас прапагандысткі Соня Памеранец, Надзежда Санковіч і іншыя.

У дасканаласці аўладаць ваеннай тэхнікай—вось задача, якую паставілі перад сабой нашы работніцы. У маючыхся на фабрыцы ваенных гуртках налічваецца 450 работніц. Перадавымі з іх з'яўляюцца нашы ордэнаноскі Ада Кісель, Вера Еўсюціна, Ксеня Еўсюціна, Вера Валошына, Соня Цепліцкая.

Нашы ордэнаносцы паказваюць найлепшыя ўзоры работы і на вытворчасці. Ксеня Еўсюціна і Вера Валошына вылучаны майстрамі брыгад. Ада Кісель

Тав. Фрыд.

вылучана сакратаром комсамольскага камітэта. Кіраўнікамі гурткоў ваенных ведаў таксама з'яўляюцца дзяўчаты—Родава, Ганчаронак, Вера Еўсюціна, Позняк і іншыя. 90 проц. жанчын здалі норму на ПВХО, 35 жанчын з'яўляюцца варашылаўскімі стралкамі.

На фабрыцы ёсць тэхнічны габінет. У ім штодзённа адбываюцца заняткі па павышэнню кваліфікацыі. Габінет з года ў год выпускае новыя кадры кваліфікаваных работніц. Вось работніца тав. Балубель. Яна была прыбіральшчыцай. Пачала вывучаць кравецкую справу і зараз працуе па шостаму разраду. Тав. Пяцельская прышла на фабрыку малакваліфікаванай, цяпер працуе па сёмаму разраду. Тав. Айзенштат, Фельдман і многія другія маюць такія-ж поспехі.

З 93 членаў ІТР на фабрыцы 43 жанчыны. Работніца Ідэльчык з'яўляецца начальнікам першага цэха і добра спраўляецца з работай. Работніца Немік працуе тэхнічным дырэктарам фабрыкі.

Работніцам нашай фабрыкі прадастаўлены ўсе магчымасці для работы, вучобы, павышэння культурнага і палітычнага ўзроўню, для прыняцця актыўнага ўдзелу ва ўсім грамадскім і культурным жыцці нашай краіны. Ці-ж абцяжарвае нашу работніцу кухня, або догляд за дзіцем, калі ў нас ёсць вельмі добрыя яслі і сталовая.

Выдатны стаханаўскі рух, які забяспечвае рост і добрабыт нашай краіны, значна падняў прадукцыйнасць працы і палепшыў матэрыяльнае становішча нашых рабочых і работніц.

Права на адукацыю, як і ўсе правы, дадзеныя нам вялікай Сталінскай Канстытуцыяй, шырока скарыстоўваюцца нашымі работніцамі. Таварышы Скапінікер, Берковіч, Трычанская і многія іншыя ў апошнія гады скончылі інстытуты і вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Совецкая жанчына — адзіная свабодная жанчына. Сэрца яе поўна любві і адданасці да магутнай радзімы соцыялізма, вялікай комуністычнай партыі і мудрага правадыра народаў таварыша Сталіна.

Намеснік сакратара парткома

фабрыкі „Кастрычнік" **Фрыд.**

БУДЗЕМ БІЦЬ ВОРАГА НА ЯГО ТЭРЫТОРЫІ

Як і ўвесь многамільённы ленінскі комсамол, я люблю вайсковую справу. З'яўляюся камандзірам санітарнага ўзвода. Я ў ліку тых чатырох дзяўчат, якія на сустрэчы пяці гарадоў па хімічных спаборніцтвах устанавілі ўсесаюзны рэкорд па пераносцы раненых.

У мінулым годзе 13 нашых лепшых стаханаўцаў зрабілі бясприкладны цяжкі ваенізаваны пераход Менск—Масква ў процігазах і процііпрытных касцюмах. У ліку гэтых 13 была і я. Совецкі ўрад высока ацаніў гэты пераход. Удзельнікі яго былі ўзнагароджаны ордэнамі „Знак почета" і граматамі ЦВК Саюза. Атрымала і я ордэн.

Канец 1936 года прынёс мне яшчэ адну нечуваную радасць. Я была членам дэлегацыі, якая ездзіла вітаць ад імя ўсяго беларускага народу Надзвычайны VIII Усесаюзны З'езд Советаў. Мне—дзяўчыне—работніцы шасцімільённы беларускі народ даручыў расказаць Надзвычайнаму VIII Усесаюзнаму З'езду Советаў, якім шчаслівым і радасным жыццём жыве беларускі народ, як бязмежна яго адданасць вялікай комуністычнай партыі Леніна—Сталіна і правадыру народаў—любімаму Сталіну. Нам таксама было даручана перадаць пісьмо беларускага народу асабіста нашаму вялікаму любімаму Сталіну. Пісьмо, якое склалі ў вершах ад імя беларускага народа лепшыя пісьменнікі Беларусі, якое вышылілепшыянашывышывальшчыцы.

У адказ на Сталінскую Канстытуцыю наша моладзь яшчэ больш згуртуецца вакол партыі Леніна—Сталіна, вакол нашага любімага друга і бацькі ўсіх народаў—таварыша Сталіна.

Ада Кісель.

Менск, ф-ка „Кастрычнік"

ВЫСОКАЕ ЗВАННЕ ЧЛЕНА ПАРТЫІ

13 год прайшло са дня смерці нашага вялікага правадыра Владзіміра Ільіча Леніна. Ніколі не забыць нам гэтай цяжкай утраты. Аб нас—працоўных жанчынах—Владзімір Ільіч асабліва многа клапаціўся. Невыказна балюча, што Ільіча няма з намі цяпер, калі пад кіраўніцтвам лепшага прадаўжальніка справы Леніна, мудрага Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна, мы дажылі да шчаслівага заможнага жыцця, калі дзейнічае Сталінская Канстытуцыя.

Як далёка шагнулі мы наперад за гэтыя гады. Непазнавальнай стала наша краіна і яе людзі. Вазьму прыклад з сябе. 13 год таму назад я была несвядомай жанчынай. У дні найвялікшай утраты муж мой, рабочы-чыгуначнік, сказаў мне: „Трэба нам, Ядзя, узяцца за работу, трэба праводзіць у жыццё ленінскія заветы".

У ленінскі прызыў ён уступіў у рады комуністычнай партыі, а я стала дэлегаткай. З 1927 года я таксама член партыі. Скончыла курсы партактыва, займалася ў марксісцка-ленінскім гуртку. З 1929 г. працую я на фабрыцы „Кастрычнік".

На фабрыцы ў нас працуе большасць жанчын. Не нарадуешся, гледзячы на іх. Усе добра зарабляюць, добра апранаюцца. Мацеры спакойны за сваіх дзяцей, бо нашы яслі адны з лепшых у горадзе.

Вось работніца Баброва. Яна ўдава, мае 6 дзяцей. Дзеці яе ў дзіцячым садзе, у школах. Дзяржава дапамагае ёй матэрыяльна ў выхаванні дзяцей. Баброва сама вучыцца, уступіла ў групу спачуваючых.

Нашы работніцы ўважліва вывучаюць вайсковую справу. Не гледзячы на мае 44 гады, я атрымала званне Варашылаўскага стралка; з 50 магчымых ачкоў выбіла 47.

На XV з'ездзе комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі мяне абралі членам ЦК КП(б)Б. На практычнай рабоце я імкнуся апраўдаць аказанае мне давер'е.

Я памятаю словы роднага нашага правадыра таварыша Сталіна, сказаныя па поваду смерці Владзіміра Ільіча:

„Няма нічога вышэй як званне члена партыі, аснавальнікам і кіраўніком якой з'яўляецца таварыш Ленін".

Менск. **Гурыновіч Ядзя.**

Тав. Гурыновіч

Тав. Файгенбаум

Тав. Кісель

Удзельнічаю ў кіраўніцтве дзяржавай

На XI Усебеларускім з'ездзе Советаў абралі мяне членам ЦВК БССР, а яшчэ раней членам горсовета і яго прэзідыума. Так я, старая работніца, прымаю актыўны ўдзел у кіраўніцтве дзяржавай.

Я дабілася таго, што мы атрымалі ў горсовеце і жактах 13 кватэр для нашых рабочых і работніц.

Стаханаўка Маліноўская з сястрой жыла ў вельмі дрэнным пакоі. Пры маёй актыўнай дапамозе ім далі другі добры пакой. Стаханаўцу Горпаненко я на фабрыку прынесла ордэр на кватэру.

Ужо так завялося, калі рабочы мае якую-небудзь скаргу, ён прыходзіць да мяне:

„Тав. Файгенбаум, разбярыся ў гэтым і дапамажы, ты-ж член урада".

Я імкнуся не аставіць без рэагавання ніводную скаргу.

За актыўную работу ў горсовеце ЦВК СССР у мінулым годзе прэміраваў мяне 500 руб.

Жыву я ў поўным дастатку. Зарабляю 300 руб. у месяц, столькі-ж зарабляе і муж.

Многа працую я над павышэннем свайго ідэйнага ўзроўню. Вучуся ў палітшколе, там-жа вывучаю матэматыку і рускі язык. У мінулым годзе набыла добрую бібліятэку. Купіла поўны збор твораў Леніна, „Пытанні ленінізма"—Сталіна, трохтомнік „Ленін і Сталін".

Чытаю я і белетрыстыку. За апошні час прачытала: „Як гартавалася сталь" Остроўскага, „Дуброўскі" Пушкіна, „Пётр Першы" Талстога і інш.

Паступіла я ў групу спачуваючых. Мая мара стаць членам комуністычнай партыі, той партыі, якую выхавалі мудрыя правадыры пролетарыята — Ленін і Сталін.

Файгенбаум

Менск
фабрыка „Кастрычнік".

ДА ЎСІХ ДЗЯЎЧАТ — ТРАКТАРЫСТАК, КАМБАЙНЕРАК І ІЛЬНОЦЕРАБІЛЬШЧЫЦ. ДА ЎСІХ МАЛАДЫХ КАЛГАСНІЦ ОРДЭНАНОСНАЙ СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

З усіх куткоў Совецкай Беларусі сабраліся мы, дзяўчаты—трактарысткі, на Ўсебеларускую нараду, каб падзяліцца вопытам сваёй работы і абмеркаваць задачы нашай далейшай барацьбы за высокі ўраджай, за выкананне лозунга таварыша Сталіна аб 7—8 мільярдах пудоў хлеба.

Наша нарада працавала ў дні, калі ўся наша радзіма вывучае даклад нашага вялікага друга і настаўніка таварыша Сталіна, вывучае зацверджаную Надзвычайным VIII З'ездам Советаў новую, Сталінскую Канстытуцыю.

Новая Канстытуцыя СССР—гэта велізарнейшы дакумент нашай эпохі, напісаны рукой мудрага і вялікага Сталіна—велізарнейшая радасць для нас, жанчын. 122 артыкул вялікай Сталінскай Канстытуцыі гаворыць пра такія правы совецкай жанчыны, якіх ніколі ні ў адной краіне не было і быць не магло, правы, аб якіх мараць мільёны жанчын капіталістычных краін.

У нашай краіне Советаў, якою кіруе слаўная большэвіцкая партыя, наш дарагі і любімы таварыш Сталін, нам, жанчынам, прадстаўлены такія правы для работы, для вучобы, для адпачынку, для кіраўніцтва дзяржавай, вытворчасцю, як і мужчынам.

Ці маглі да рэволюцыі марыць нашы мацеры аб тым шчаслівым і радасным жыцці, аб такіх правах, якія маем мы, совецкія дзяўчаты? Якое жудаснае, якое горкае жыццё было нашых мацерэй да рэволюцыі, да таго, пакуль не былі прагнаны з нашай зямлі памешчыкі, кулакі і іх чэлядзь!

„Сапраўды, калі падумаць, што прадстаўлялі сабой жанчыны раней, у старыя часы. Пакуль жанчына была дзяўчынай, яна лічылася, так сказаць, апошняй з працоўных. Працавала яна на бацьку, працавала не пакладаючы рук, і бацька яшчэ папракаў: „Я цябе кармлю". Калі яна станавілася замужняй, яна працавала на мужа, працавала так, як яе прымушаў працаваць муж, і муж-жа яе зноў-жа папракаў: „Я цябе кармлю". Жанчына ў вёсцы была апошняй з працоўных". Такую яскравую ацэнку жыцця жанчыны да рэволюцыі даў таварыш Сталін у сваёй прамове на прыёме ударніц бураковых палёў.

Толькі Совецкая ўлада, толькі перамога калгаснага ладу вывелі нас, жанчын, на шырокую дарогу, зрабілі для нас працу спра-

На усебеларускай нарадзе стаханавак—трактарыстак. На здымку: сакратар ЦК КП(б)Б таварыш Н. Ф. ГІКАЛО, сакратар ЦК КП(б)Б таварыш Д. І. Валковіч, загадчык сельскагаспадарчага аддзела ЦК КП(б)Б тав. Картукоў сярод трактарыстак, удзельніц усебеларускай нарады. (Фота Я. Салавейчыка).

вай гонару, справай славы і герайства.

Калгасны лад нарадзіў дзесяткі энтузіястаў—арганізатараў, сапраўдных герояў працы. Сярод узнагароджаных ордэнамі за поспехі ў развіцці сельскай гаспадаркі не мала жанчын і маладых дзяўчат нашай Совецкай Беларусі.

Баявая стаханаўская работа знатных дзяўчат—трактарыстак—Пашы Ангелінай, Пашы Кавардак і іх падруг выклікала ў нас, дзяўчат Совецкай Беларусі, гарачае жаданне стаць такімі-ж стаханаўкамі, як яны. І многія з нас пашлі на курсы трактарыстаў, камбайнераў. І ў гэтым годзе, першым годзе работы на трактарах, многія з нас па-ўдарнаму, па-стаханаўскаму папрацавалі. Комсамолка Марыя Савельева з Расонскай МТС першая з дзяўчат у нашай рэспубліцы выпрацавала на сваім трактары 1015 гектараў.

Брыгада, якой кіруе член ЦВК СССР Зоня Рачок дала ў сярэднім на трактар 1110 гектараў.

Трактарыстка Марыя Палавінчэнка з Чырвонапольскай МТС на сваім трактары за сезон выпрацавала 1222 гектары. У гэтым дапамагло нам усесаюзнае спаборніцтва жаночых трактарных брыгад, якое праводзілася па рашэнню Цэнтральнага Камітэта ВЛКСМ і Наркамзема СССР.

Але мы не зазнаемся. Мы павінны яшчэ лепш працаваць, каб выканаць пастаўленыя партыяй і ўрадам перад Беларусіяй задачы—дабіцца не менш 90—100 пудоў зярна ў сярэднім з гектара. 4—5 цэнтнераў ільну, 5—6 цэнтнераў канапель, 900—1100 пудоў бульбы. Няма больш ганаровай задачы для нас дзяўчат, чым быць у першых радах барацьбітоў за выкананне гэтых важнейшых задач. Ужо ў гэтым годзе мы абавязваемся працаваць так, каб кожны трактар, на якім будуць працаваць дзяўчаты, выпрацаваў не менш 1.000 гектараў.

Для таго, каб выканаць узятыя намі абавязацельствы, нам неабходна больш вучыцца і авалодваць тэхнікай сваіх машын, трактароў, камбайнаў, ільноцерабілак.

Мы абавязваемся выкарыстаць зімовы перыяд для агульна-адукацыйнай, тэхнічнай і палітычнай вучобы. Мы спадзяемся, што ў гэтым годзе нам дапамогуць комсамольскія арганізацыі, ад якіх мы чакаем дапамогі дакладчыкамі, настаўнікамі, лектарамі.

Мы заклікаем усіх дзяўчат нашай ордэнаноснай Совецкай Беларусі, якія працуюць трактарысткамі, камбайнеркамі, механікамі, брыгадзірамі і звеннявымі, заразжа пачаць разгорнутую падрыхтоўку да вясны 1937 года. Адрамантуем на „выдатна“ нашы трактары і астатні сельскагаспадарчы інвентар. Падрыхтуем добрае насенне. Выкарыстаем зімовы час для вывучэння агратэхнікі, для атрымання палітычных і агульнаадукацыйных ведаў.

Няхай кожная маладая дзяўчына, якая працуе на трактары, камбайне, якая працуе брыгадзірам, звеннявой, уступіць у сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку і правядзенне веснавой сяўбы.

Мы прапануем прадоўжыць і на 1937 год усесаюзнае спаборніцтва жаночых трактарных брыгад. Мы зварачаемся да ўсіх дзяўчат, якія навучаюцца на курсах трактарыстаў,—вучыцеся, не шкадуючы сіл, вучыцеся ўсе на выдатна з тым, каб кожная з вас з першых дзён работы на трактары працавала-б па стаханаўску.

У свой час трактарысты, камбайнеры Паўночна-Каўказскага, Заходня-Сібірскага і Азова-Чарнаморскага краёў выступілі з прапановай навучыць сваіх жонак рабоце на трактарах і камбайнах. Мы выклікаем усіх жонак і сясцёр трактарыстаў і камбайнераў навучыцца кіраваць і працаваць на трактарах і камбайне.

Наша рэспубліка працуе на рубяжы з капіталістычным светам. Гэта абавязвае нас не толькі быць добрымі вадзіцелямі сельскагаспадарчых машын, але і вывучыць вайсковую справу.

Ганаровы абавязак маладых дзяўчат—калгасніц—стаць варашылаўскімі стралкамі, здаць нормы на СПХА і ГСА, а галоўнае—быць пільнымі, умець распазнаваць контрэволюцыйныя махінацыі кулацкіх недабіткаў і выкараняць да канца злоснейшых ворагаў партыі, совецкага ўрада і ўсяго народу—трацкісцка-зіноўеўскіх гнусных забойцаў, шкоднікаў, іх пасобнікаў--правых, якія па ўказцы сваіх фашысцкіх гаспадароў імкнуцца пралезці ўсюды з тым, каб нашкодзіць краіне Советаў. Таму, як правільна гаварыў таварыш Сталін, трэба быць асабліва пільнымі, тым больш нам на граніцы.

Калі варожыя полчышчы нападуць на нашу краіну, нашы бацькі і браты, нашы мужы, як адзін, стануць на яе абарону. Мы, жанчыны, заменім іх і, па-стаханаўску працуючы, будзем умацоўваць наш калгасны лад, а калі спатрэбіцца, сядзем на танк, на кулямётную тачанку і разам з доблеснай Чырвонай Арміяй будзем граміць ворага.

Жыць стала весела і добра. Мы будзем не толькі добра працаваць, але весела і культурна адпачываць. Нашы гучныя, бадзёрыя галасы будуць спяваць вясёлыя, жыццерадасныя песні, песні пра вялікага Сталіна, які даў нам такое шчаслівае, радаснае жыццё.

Мы—шчаслівыя дзяўчаты—шлем сваё гарачае прывітанне і шчырую ўдзячнасць нашай партыі, нашаму дарагому і любімаму Сталіну.

Няхай жыве наша вялікая, магутная соцыялістычная радзіма!

Няхай жыве мудры і любімы правадыр народаў—Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

Па даручэнню нарады падпісалі брыгадзіры і тысячніцы-трактарысткі.

Жаночая трактарная брыгада Цімкавіцкай МТС

З усіх куткоў ордэнаноснай Совецкай Беларусі з'ехаліся ў Менск 380 лепшых трактарыстак—стахановак, каб падзяліцца вопытам сваёй работы, падвесці вынікі сацыялістычнага спаборніцтва трактарных жаночых брыгад за 1936 год і намеціць канкрэтныя мерапрыемствы барацьбы за высокі ўраджай у 1937 г., за выкананне лозунга таварыша Сталіна аб 7—8 мільярдах пудоў хлеба.

Удзельнікі нарады—гэта маладыя, жыццерадасныя дзяўчаты. Самай маладзейшай з іх—16 год, а самай старэйшай—26 год.

Гэтыя сотні маладых дзяўчат у 1936 годзе паспяхова працавалі на трактарах. Цэлыя жаночыя трактарныя брыгады вышлі на калгасныя загоны, каб змагацца за высокія паказальнікі прадукцыйнасці працы.

Адна за другой выходзяць на трыбуну гэтыя выдатныя дзяўчаты калгасных палёў. Іх прамовы напоўнены гарачай любоўю да вялікага Сталіна, тварца выдатнейшага закона—новай Канстытуцыі.

Поспехі, якіх дабіліся асобныя трактарысткі і цэлыя брыгады,—лепшы доказ таго, як буйна заквітнелі таленты нашых жанчын, дзяўчат, авалодваючых перадавой тэхнікай сельскай гаспадаркі.

Сярод удзельніц нарады—знатны брыгадзір трактарнай брыгады Копыльскай МТС, член урада СССР і БССР—Зоня Рачок. Гэта яна з'яўляецца ініцыятарам усебеларускага соцыялістычнага спаборніцтва трактарных брыгад.

На нараду Зоня Рачок прыехала з бліскучымі паказчыкамі: на кожны трактар яе брыгады выпрацавана ў сярэднім па 1170 га. А асобныя трактарысткі, як Маня Серада і Адэля Наркевіч, выпрацавалі па 1224 га. Рамонт трактароў брыгада скончыла.

У сваім выступленні Зоня Рачок заклікала ўсіх брыгадзіраў трактарных брыгад у 1937 годзе змагацца за 1500 га на кожны трактар.

Зоня Рачок не адзіная. Ніна Кашуба—брыгадзір трактарнай брыгады Слуцкай МТС, Ганна Жук з гэтай-жа МТС, Савельева—з Расонскай МТС, Палавінчэнка—з Чырвонапольскай, Шэвелева—з Церахоўскай, Каваленка—з Бешанковіцкай, Шабашова і Мураўёва—з Высачанскай МТС і рад другіх,—усе яны паказалі ў 1936 годзе высокія ўзоры работы.

Семнаццаць год было Ніне Кашуба, калі яе паслалі на курсы трактарыстаў. Яна скончыла на „выдатна", і яе паслалі брыгадзірам жаночай трактарнай брыгады.

Ніну сустрэлі насмешкамі. З яе смяяліся, што яна—баба—паедзе на трактары.

Не прайшло і тыдня, як Ніна Кашуба і яе брыгада паказалі, на што здольны дзяўчаты. Тады тыя, што насмяхаліся над імі, сталі сароміцца сваіх няўдалых жартаў. А ў апошнія дні веснавой сяўбы калгаснікі запрашалі дзяўчат абавязкова прыехаць у калгас увосень і на будучы год.

Адэля Наркевіч—трактарыстка з брыгады Зоні Рачок. Маладая чарнявенькая дзяўчынка расказвае, што яе таксама не зусім ветліва сустрэлі першы раз на полі. Не верылі, смяяліся. Але не смяялася Адэля. Яна нават у пачатку веснавой сяўбы выклікала на соцспаборніцтва вопытнага трактарыста

Гераіні калгас

Алеся Гладкова. Гладкі пакры
дзіўся за тое.

Падвялі вынікі: Адэля перагна
Гладкага на 140 га. Пераходн
сцяг МТС быў на трактары Адэ
Наркевіч.

За 1936 год Адэля Наркевіч
сваім напарнікам выпрацава
1200 га і з'эканоміла гаруча
1.000 кілограм. На 1937 год я
смела бярэ абавязацельства выпр
цаваць 1500 га.

Маладыя трактарысткі ўважлі
прыслухоўваюцца да расказа
трактарысткі Марыі Савельева
з Расонскай МТС.

— Свой абавязак я трошкі пер
выканала,—скромна заканчвае та
Савельева. — Мой трактар да
1015 га.

Апошнія яе словы заглушае гу
апладысментаў.

Тав. Саўчанка з Чырвонапол
скай МТС у сваім выступленні ра
казвае не толькі аб сваёй рабоц
а аб усёй МТС. Яна расказвае, я
іх МТС з'эканоміла 80 тысяч ру
лёў, як яна адмовілася ад датаць
ў 30 тысяч рублёў.

Дзяўчаты і на 1937 г. бяруць н
сябе канкрэтныя абавязкі. Многі
называюць лічбы 1200—1500 га.

Кожная трактарыстка хоча ву
чыцца, кожная хоча ведаць хімік
фізіку, матэматыку і іншыя навук

Маладыя дзяўчаты мараць быц
не толькі лепшымі трактарысткам
а ў бліжэйшым будучым стац
брыгадзірамі, механікамі, дырэкта
рамі МТС—стаць сапраўдным
раінямі працы на соцыялістычны
палях.

Трактарысткі з Палесся, Дры
сеншчыны, Асвейшчыны расказ
ваюць, як па той бок мяжы, су
проць калгасных палёў, часта зб
раюцца натоўпы сялян і з вялікай
зайздрасцю глядзяць на працуючы
трактары, на новыя калгасныя бу
дынкі, на шырокія загоны палёў.

Дзяўчаты-трактарысткі добр
памятаюць, што мы жывём на ру
бяжы з капіталістычным светам
Яны ведаюць, што іх абавязан
быць не толькі прыкладнымі вадзі
целямі сельскагаспадарчых машын
але і добрымі абаронцамі сваёй ра
дзімы.

Горача сустрэлі ўдзельніцы на
рады сакратара ЦК КП(б)Б Ніка
лая Фёдаравіча Гікало.

...асных палёў

Галасы „Няхай жыве вялікі тварэц Канстытуцыі — таварыш Сталін!“ громкае „ўра Сталіну!“ доўга чуліся ў зале.

У сваім выступленні тав. Гікало адмеціў вялікую любоў трактарыстак да таварыша Сталіна, вялікую іх любоў да сваёй радзімы. Нікалай Фёдаравіч выказаў упэўненасць, што гэтыя маладыя трактарысткі і камбайнеркі, калі гэта патрабуецца, здолеюць з трактара перасесці на танк, каб дастойна абараняць сваю радзіму.

Асаблівую ўвагу Нікалай Фёдаравіч звярнуў на тое, што маладыя дзяўчаты—вялікая сіла на вёсцы, што трактарысткі, брыгадзіры, камбайнеркі павінны яшчэ больш валодваць тэхнікай, павінны вучыцца яшчэ больш, каб яшчэ больш апраўдаць сваё высокае званне перадавых дзяўчат калгаснай вёскі.

Прамова тав. Гікало была выключна цёплай і задушэўнай. Нікалай Фёдаравіч заклікаў трактарыстак правесці веснавую сяўбу яшчэ лепш, каб выканаць словы мудрага Сталіна аб 7—8 мільярдах пудоў зерна.

* * *

Нарада скончана. Дзяўчаты накіраваліся аглядаць Менск. Яны наведалі Дом Чырвонай арміі, Палац піонераў і окцябрат.

Да ўсяго яны прыглядаліся, усё яны запаміналі, каб расказаць потым у сябе дома.

Так прайшоў дзень. Настаў вечар. Вясёлыя і радасныя сустрэчы з стаханаўцамі чакалі дзяўчат на прадпрыемствах горада Менска.

Варштатабудаўнічы завод імя Вашылава, фабрыку „Кастрычнік“, фабрыку „Комунарку“ наведалі трактарысткі. Яны падрабязна знаёміліся з работай у цэхах.

Пасля, за таварыскай вячэрай трактарысткі абменьваліся вопытам сваёй работы са стаханаўцамі і стаханаўкамі прадпрыемстваў. Тут-жа абяцалі трымаць цесную сувязь. Самадзейнасцю, спевамі, танцамі закончыліся сустрэчы знатных людзей—будаўнікоў соцыялізма горада і вёскі.

Жаночая трактарная брыгада Кармянскай МТС

Пасля сканчэння нарады трактарысткі, натхнёныя выступленнямі нашых кіраўнікоў партыі і ўрада і расказамі лепшых трактарыстак, раз'ехаліся па сваіх раёнах, каб яшчэ лепш падрыхтавацца да веснавой сяўбы, каб яшчэ лепш змагацца за ажыццяўленне лозунга таварыша Сталіна—даць у бліжэйшыя два—тры гады 7—8 мільярдаў пудоў хлеба.

Стасіна.

СУСТРЭЧА Ў РЭДАКЦЫІ

У рэдакцыі журнала „Работніца і калгасніца Беларусі“ адбылася сустрэча брыгадзіраў трактарных брыгад, тысячніц, камбайнерак і ільноцерабільшчыц з работнікамі журнала.

На гэтай сустрэчы прысутнічаў нарком земляробства тав. Бэнек, намеснік загадчыка сельска-гаспадарчага аддзела ЦК КП(б)Б тав. Дындзін.

У таварыскай гутарцы, за чашкай чая трактарысткі гаварылі аб сваіх дасягненнях і тых перашкодах, якія яны сустракалі ў мінулым годзе на рабоце.

Тав. Касцюковіч, з Ушацкай МТС, расказвала, як ёй перашкаджалі ў рабоце. Былі ў яе брыгадзе хлапцы, якія дабіваліся, каб яна пакінула трактар і зусім не працавала трактарысткай.

Або Кузняцова з Дзяржынскай МТС. Яна вучылася на курсах камбайнераў, скончыла іх на „выдатна“, але дырэктар МТС не прызначыў яе працаваць на камбайн, а прызначыў хлапца.

У сваім выступленні нарком земляробства тав. Бэнек спыніўся на важнасці выхавання жаночых кадраў асабліва ў нас, у прымежнай рэспубліцы. Тав. Бэнек адзначыў, што з выхаваннем жаночых кадраў у Беларусі справа абстаіць дрэнна. Трактарысткам у іх рабоце дапамагалі недастаткова, асабліва ў Асвейскай, Дзяржынскай, Крупскай, Грэцкай МТС і радзе іншых. Дырэктары гэтых МТС не зразумелі ўсёй важнасці гэтага пытання. Некаторых дырэктароў ЦК КП(б)Б за гэта зняў з работы (Дзяржынск) і ў далейшым будзе таксама прыцягваць да адказнасці тых дырэктароў, якія не будуць дапамагаць выхоўваць жаночыя кадры.

Тав. Бэнек заклікаў трактарыстак—тысячніц, камбайнерак і брыгадзіраў расшыраць свае рады, навучыць сваю таварышку, сястру працаваць на трактары, каб у будучым годзе мы мелі ўжо не 570 трактарыстак, а 3.000 чалавек.

У сваіх выступленнях гераіні калгасных палёў абяцалі працаваць яшчэ лепш, даць яшчэ больш высокія паказчыкі работы. Дзяўчаты абяцалі трымаць цесную сувязь з журналам, пісаць аб сваёй рабоце, аб перашкодах, калі яны будуць.

На гэтай-жа сустрэчы заключылі дагавор на соцыялістычнае спаборніцтва два брыгадзіры трактарных брыгад: знатная трактарыстка Зоня Рачок з Копыльскай МТС і Варвара Ушава з Кармянскай МТС.

Яны ўзялі на сябе абавязак даць на кожны трактар не менш, як 1500 га.

ЗРАБЛЮ 1200 га

На 1-й Усебеларускай нарадзе трактарыстак
Выступленне трактарысткі Савельевай (Расонская МТС)

Таварышы! Дазвольце мне перадаць ад трактарыстак Расонскай МТС нашай першай нарадзе трактарыстак палкае стаханаўскае прывітанне.(Апладысменты). Дазвольце таксама перадаць прывітанне нашаму дарагому і любімаму Сталіну. (Апладысменты).

Зараз я вам раскажу аб сваёй рабоце. У пачатку 1936 года я была на Усебеларускай нарадзе перадавікоў ураджайнасці. Была на прыёме ў тав. Бэнека. На гэтым прыёме дзяўчаты бралі абавязкі даць на трактары па 1.000—1100 га. Таварыш Бэнек запытаўся ў мяне: „Што-ж, таварыш Савельева, якія бярэш абавязкі па Расонскай МТС?". У нашай МТС зямля дрэнная—там многа гор і каменняў. Падумала я, усе бяруць абавязкі, мне таксама нельга маўчаць. І я ўзяла абавязак—даць 1000 га. Таварыш Бэнек гаворыць: „Глядзі, тав. Савельева, каб не падкачала!"

Прыехала я ў МТС, сабрала ўсіх трактарыстаў і расказала ім, які абавязак я на сябе ўзяла. Усе сталі з мяне смяяцца:„ Калі Савельева выпрацуе 1.000 га, то мы выпрацуем па 2.000". Я ўсё-ж парашыла паставіць на сваім і з сваім напарнікам—трактарыстам, які першы год працуе на ХТЗ, я выехала ў поле. На 1 мая мы заваявалі пераходны сцяг і былі прэміраваны. А калі мы атрымалі Сталінскую Канстытуцыю, у нас з'явілася яшчэ больш энергіі да работы. І цяпер я магу сказаць, што абяцанне сваё я крыху перавыканала. Я дала на трактары 1015 га. (Апладысменты).

Заработала я 946 працадзён (апладысменты), на якія атрымала грашыма—2365 рублёў (апладысменты) і хлеба—2838 кілограм. (Апладысменты). Гаручага з'эканомілі 2916 кілограм, а за сваю змену я з'эканоміла—1458 кілограм. (Апладысменты).

За гэты год я атрымала прэміі: ад Райвыканкома—200 рублёў і пачэсную грамату, ад МТС—125 рублёў і ад тав. Бэнека—з Наркамзема—200 рублёў (апладысменты), а ўсяго 525 руб. і пачэсную грамату.

Я не ведаю, як мне аддзякаваць нашу комуністычную партыю, што яна не забывае нас—жанчын! Ці думала я раней, што ўся Беларусь будзе ведаць Савельеву? Я сяджу тут і маё сэрца радуецца,—вось тав. Бэнек выступаючы, гаварыў, што ў Расонскай МТС ёсць такая Савельева. Ці думалася мне, што мяне будуць успамінаць нашы кіраўнікі?! Галоўнае, я не ведаю, як мне аддзякаваць таварыша Сталіна за тое, што ён даў нам такое шчаслівае жыццё. (Апладысменты).

Таварышы, на 1937 год я бяру на сябе трошкі большы абавязак—даць на трактары 1200 га. Хаця ў нас каменняў многа і горы вялікія, але па-большэвіцку вазьмуся за работу і выканаю свой абавязак. (Апладысменты).

Галоўнае, таварышы, гэта тое, што ў нашым раёне тыя, хто раней смяяўся, далёка адсталі ад мяне. (Апладысменты). Іх трактары далі не больш 700 га і цяпер яны гавораць: давай, Савельева, соцдагавор заключаць. Я адказваю ім: давайце, заключым. І думаю: усё роўна рэкорд будзе маім.

У рабоце мне дапамагаў наш брыгадзір тав. Беляеў. Дзяўчат у нашай брыгадзе было толькі тры. Не было ў нас халастых перагонаў, і таму мы з'эканомілі гаручае. Вось я тут чула, што ў другім раёне трактарыст Сяргеяў зрабіў на трактары 1100 га і ў яго кавалкі зямлі былі па 25—15 га, а ў мяне кавалкі былі ў большасці па 0,10 га, і толькі адзін раз за ўсё лета мне прышлося ўзараць кавалак у 9 га.

Даю абяцанне, за сезон 1937 года выпрацаваць на трактары 1200 га. (Апладысменты).

Няхай жыве наша комуністычная партыя на чале з нашым дарагім, любімым таварышам Сталіным! (Апладысменты, пераходзячыя ў авацыі).

Дэкада грузінскага мастацтва ў Маскве. 8 студзеня ў Дзяржаўным Акадэмічным Вялікім тэатры Саюза ССР адбыўся канцэрт грузінскай музыкі, песні і пляскі. НА ЗДЫМКУ: выступленне дзяржаўнага этнаграфічнага хора Усходняй Грузіі пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча мастацтва А. Каўсадзе. Фото Б. Фішмана (СФ).



Гульня ў „будзёнаўцаў“ у Барысаўскім дзіцячым садзе.

ВЯСЁЛАЕ СВЯТА

У дзвярэй прыгожага Менскага Дома Чырвонай арміі імя тав. Варашылава ў той дзень стаяла асаблівая „вахта“. Гэта два велізарных дзеда-мароза, засыпаных „снегам“.

Пры ўваходзе дзеці ўбачылі прыгожа прыбраную ёлачку. Як тут утрымацца і не патанцаваць вакол прыгожага дрэва? Дуся, Стасік і Эра, узяўшыся за рукі, сталі запяваць:

Ёлка, ёлка
зялёная іголка...

Але рэбятам не было часу. Яны спяшаліся на другі паверх, дзе ў двух самых прыгожых залах іх ужо чакалі.

Вясёлая песня разнеслася па ўсяму дому. Гэта дзесяткі дзіцячых галасоў з захапленнем спявалі аб нашай шчаслівай радзіме, велізарнай, неабдымнай, якая так клапоціцца і любоўна выхоўвае сваіх маленькіх грамадзян.

Песні змяніліся гульнямі і танцамі. Узяўшыся за рукі заскакалі „кот з сабакай“. Навокал іх група рэбят стараліся адгадаць, хто пад маскамі. А вось і белая, пушыстая „сняжыначка“ старанна стала вытанцоўваць „Яблычка“ разам з клоунам.

А бацькі? Яны тут. І на ўсіх тварах шырокая ўхмылка, ухмылка радасці і гордасці.

Заглянем у другую залу—да дашкольнікаў. Яркай, жывой істужкай расцягнуліся вакол ёлкі ў рытмічным руху, чатырохпяці-шасцігадовыя малышы. Радасцю і задорам гарэлі іх вочкі і ружовыя шчочкі. Ласкава ўсміхаючыся ім, як быццам любуючыся імі, са сцяны глядзеў на іх той, хто даў ім гэта радаснае, прыгожае дзяцінства,—вялікі Сталін.

Здавалася, да вечара гатовы спяваць і скакаць гэты жывы букет вясёлых дзіцячых фігур... Але вось сігнал. Дзяцей запрасілі ў глядзельную залу. Там для іх выступалі маленькія і дарослыя акцёры.

А вось і самы радасны момант—раздача падарункаў. Кожны атрымаў па мяшочку салодкага, цацку. Маленькія тут-жа разглядвалі атрыманыя лялькі, калясачкі, балалаечкі, вяртушкі. Многія рэбяты атрымалі гульні, канструктары, рыкашэты. Радасці не было канца!

Закончылі свята рэбяты вясёлай песняй аб тым, хто з'яўляецца любімым другам дзяцей, песняй аб Вялікім Сталіне.

Каганоўская.

РАДАСЦЬ І ШЧАСЦЕ

Для сустрэчы новага, шчаслівага 1937 года жонкі ІТР нашага соўгаса арганізавалі для дзяцей ёлкі ў школе, у яслях, у дзіцячым садзе і пяць ёлак на кватэрах рабочых і ІТР.

Асабліва актыўны ўдзел у гэтым прынялі тт. Саламонава, Нізоўская, Лапіцкая, настаўніца Шэўчэнка, 63-гадовая маці агранома тав. Ільіч. Большая частка цацак, якімі была прыбрана ёлка, былі зроблены самімі жанчынамі.

На ёлках прысутнічалі не толькі дзеці, былі запрошаны і бацькі. Радасцю поўніліся іх сэрцы, калі яны глядзелі на дзяцей.

Жонкі ІТР арганізавалі ў клубе надзвычайную сустрэчу новага года для дарослых. Тут сабраліся ўсе рабочыя соўгаса і калгаснікі з бліжэйшых вёсак. Выступаў харавы гурток. Асабліва падабаліся ўсім частушкі, танцы, бал-маскарад.

І ўсе адчувалі, што гэта радасць, гэта вясёласць, асветленая вялікай сталінскай Канстытуцыяй, з кожным годам будзе расці і шырыцца, таму што нас вядзе ўперад да новых перамог вялікі, мудры Сталін.

Б. Элькіна.
соўгас імя Леніна

ПАД СЦЯГАМ СТАЛІНСКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ

Сірата Раіна расла і „выхоўвалася“ на кухні пана Раташынскага. Выросла, і як усе сялянскія дзяўчаты марыла аб лепшым жыцці, аб мужы не п'яніцы, які-б не біўся, быў добрым работнікам. Марыла аб сваёй гаспадарцы, хаце, дзецях і невялічкім—ёй многа не трэба—надзеле зямлі.

Мужа Раіна знайшла. Быў ён добры, ласкавы, не драчун і не п'яніца, але бедны. Быў ён батрак з вёскі Зенькавічы, меў толькі ўпрамы характар, ды моцныя рукі.

Думка аб сваёй гаспадарцы не пакідала маладых. Многа працавалі, адкладвалі грошы. Раіна марыла аб сваёй зямлі, мыючы бялізну ў папа, у памешчыка. Яна марыла аб сваім надзеле, працуючы на кулацкіх палях, не разгінаючы спіны.

Ды як ёй было не марыць, калі навокал было шмат пладароднай зямлі, леса і душыстых палёў.

Але зямля, лугі належалі панам Радзівілу, Дамянецкаму і кулакам. Усё гэта было чужое. Раіна Рыгораўна, як і шмат іншых беднякоў, магла толькі з зайздрасцю глядзець на чужыя багацці, цяжка ўздыхаючы ды накапліваць злобу на багацеяў.

Бедната вёскі Зенькавічы ў растаптаных лапцях, даматканых сермяжках і рубахах ішла з катомкамі за плячыма, палахліваазіраючыся кругом, нанімацца ў пастухі да кулакоў, у батракі да памешчыкаў, у плытагоны да лесапрамыслоўца. Але не ўсе маглі знайсці сабе работы тут, а далёка не пускалі—пашпарта не выдавалі.

У пошуках работы хадзіў і муж Раіны, і сама яна. А як падрос старшы сынок Саша—маці яму сашыла торбу, бацька справіў новыя лапці—і змовілі ў пастушкі да кулака Прыбытка.

Так абстаяла справа да рэвалюцыі.

* * *

Зямлю Раіна Рыгораўна з мужам атрымалі пасля вялікага Кастрычніка. Але атрымала тады, калі сіла, маладосць, здароўе—усё пайшло на кулакоў.

Часта задавала яна сабе пытанне: навошта зямля, калі сілы ўжо няма. Вось калі-б гэта зямля тады, калі была сіла, здароўе! Сама кволая, муж з вайны звярнуўся хворы, а ў 1921 г. памёр. Няма каня, плуга.

І адказалася ад зямлі Раіна... Узяла сабе толькі невялічкі агародзік і любоўна пачала яго апрацоўваць. Часта глядзела на ўчасткі зямлі, якія атрымалі сяляне і слёзы радасці цяклі з яе вачэй. Зямля, аб якой сотні год марылі сяляне—належыць ім.

А ў галаве ў самой роіліся думкі:—„няўжо я ўжо ні навошта не прыгодна? Няхай няма фізічных сіл, але я-ж магу яшчэ прынесці шмат карыснага совецкай уладзе, шмат дапамагчы ёй.

Раіна Рыгораўна Колас.

І стала дапамагаць, дзе толькі магла. Выступала на сялянскіх сходах, арганізоўвала бяднячак. Як толькі пачалі арганізоўваць калгасы—Раіна Рыгораўна з'явілася актыўным застрэльшчыкам калгаснага ладу. Сама з сям'ёй першая ўступіла і пачала арганізоўваць жанчын.

Калгас за некалькі дзён вырас да 50 гаспадарак. Дружна бралася бедната за работу. Але гэта працягвалася нядоўга: кулацкія байкі, што хутка вайна—усіх калгаснікаў гуртам пагоняць на вайну, а жонак прымусяць працаваць—зрабілі свае справы. Хісткія элементы пачалі выходзіць з калгаса. Засталася толькі моцнае ядро з 6 гаспадарак, у тым ліку і Раіна Рыгораўна. Надыходзіла вясна, трэба было выходзіць у поле, а народу было мала.

І пашла Раіна Рыгораўна па хатах народ збіраць. Сароміла людзей, што яны паслухаліся кулакоў, угаварвала, каб яны вярнуліся ў калгас. Каб пазбавіцца ад надаедлівай бабы—запіраліся ў хатах. Убачаць, што Раіна Рыгораўна ідзе—дзверы на засоў.

Не астанаўлівала гэта настойлівую Раіну Рыгораўну. Яна заходзіла ў хату раніцой, лавіла на задворках мужчын, калі яны кармілі жывёлу, вяла гутарку з бабамі ў калодзежаў.

На сходах выступала, звала ў калгас.

— Вось язва,—гаварылі мужыкі. Але сорамна ім стала сваёй трусасці, сорамна стала, што пакінулі калгас.

Раіна Рыгораўна дапамагла сельсовету аднавіць свой калгас, дапамагла і раскулачыць кулакоў.

Не прапала праца Раіны: хутка ў калгас уступіла ўся бедната вёскі Зенькава, уступілі цвёрда, назаўсёды.

* * *

У памяшканні праўлення калгаса „Іскра Калектывізацыі“, у прыгожай шафе хаваецца акт на вечнае карыстанне зямлёй. Даўно ўжо няма паноў Радзівілаў, Домянецкіх, Прыбыцкіх. Іх землі, сенажаці і выпасы—усё гэта багацце калгаса, усё гэта навечна перададзена калгаснікам. Зямля, да якой спрадвечна цягнуліся жадныя рукі хлебароба, знайшла свайго гаспадара.

Тысячу чатырыста гектар зямлі мае калгас, любоўна апрацоўвае яе. Добрыя ўраджаі атрымоўвае калгас, добрая пшаніца расце на палях калгаса. І дзяржаве, і сабе хапае.

Адным з першых у раёне калгас закончыў уборку зернавых і першым выканаў свае абавязкі перад дзяржавай. Апошні рэйс са збожжам рабіла грузавая машына калгаса ў Негарэлае на склад „Заготзярно“ 15-га жніўня, замест 1 кастрычніка вызначанага па плану.

Трыццаць дзве тоны жыта прадаў ужо калгас канторы „Закупхлеб". Шэсцьдзесят тон бульбы прадалі калгаснікі канторы „закупбульбы".

План ільнонарыхтовак калгас выканаў на 150 процантаў. 11.000 руб. атрымаў калгас толькі надбаўкі за лён, зданы звыш аплаты!

Даўно калгас разлічыўся з дзяржавай і МТС. Не любяць калгаснікі быць даўжнікамі.

Кожны калгаснік ужо ведае, што працадзень яго сёлета важыць: 2 кгр збожжавых, 10 кгр бульбы і не менш чым 75 кап. грашыма. Грошы гэта пакуль яшчэ арыентыровачна, бо шмат грошы яшчэ атрымае калгас за лесанарыхтоўкі і лесавывазкі.

Калгас „Іскра Калектывізацыі" па ўсіх гаспадарча-палітычных кампаніях перадавы ў раёне. Не дармо ў пярэднім вуглу праўлення калгаса ўжо другі год красуецца пераходны чырвоны сцяг Райвыканкома. Сцяг да многага абавязвае. У зенькаўцаў ужо ўкаранілася жаданне працаваць так, каб чырвоны сцяг назаўсёды знаходзіўся ў калгасе. Не хочуць калгаснікі траціць калгаснага гонару.

Куды не пойдзеш, усюды дружна і аддана працуюць калгаснікі. На свінаферме, на малочнай ферме, на канюшні—усюды людзі з любоўю адносяцца да даручанай ім справы. Звыш 70 стаханаўцаў, звыш 100 ударнікаў мае калгас. Гэта лепшыя людзі калгаса, былыя беднякі, батракі.

Да надыходзячай вясны ў калгасе ўжо ўсё падрыхтавана. Поўнасцю засыпана насенне, праверанае на чыстату і ўсхожасць. Да 25 студзеня калгаснікі мяркуюць поўнасцю вывезці на поле мінеральнае ўгнаенне. Кожныя тры дні калгасніцы абходзяць усе хаты і збіраюць попел. Па плану яго патрэбна сабраць 177 цэнтнераў. К пачатку лютага будзе адраманцтован увесь сельскагаспадарчы інвентар.

Працуюць дружна калгаснікі, жывуць заможна і культурна. У кожнага чыста і ўтульна ў хаце, у кожнага абавязкова радыё.

Калгасная вуліца—гэта не ранейшая гразкая вясковая вуліца. Гэта роўны, шырокі праспект, па абоіх баках абсаджаны дрэвамі, па абоіх баках дрыўляныя тратуары.

Калгас мае свае культурныя ўстановы: клуб, няпоўную сярэднюю школу. Праўда, памяшканне школы малавата, бо яна абслугоўвае дзяцей не толькі гэтага калгаса, але і іншых. Калгас пабудаваў лазню, яслі, будуе памяшканне пад кааперацыю. Не пазнаць былую вёску Зенькавічы!

Прыкладная работа калгаснікаў не перашкаджае ім і прыкладна адпачываць. У сваім клубе яны, не менш 4-х разоў у месяц, глядзяць лепшыя кінокарціны. „Мы з Кранштату", „Чапаеў", „Радзіма кліча" і шэраг іншых кінокарцін калгаснікі глядзелі ў сябе, у калгасе. А не то, дык на сваю машыну, і ў кіно—у мястэчка Узду. Працуе ў калгасе свой драмгурток, прыязджаюць і з соўгаса „Пагранічнік". Калгас мае свой аркестр, які часта грае ў клубе. Весела жывуць калгаснікі!

Кіраўніцтва калгаса ў надзейных руках, бо кіруе калгасам Раіна Рыгораўна Колас—член ЦВК БССР. Раіна Рыгораўна з'арганізавала навокал сябе моцны калгасны актыў, які дапамагае ёй у рабоце. З актывам яна раіцца, да парад лепшых людзей прыслухоўваецца. Сама яна кажа:—„Справу рашаюць людзі, таму я іх берагу, а яны мяне, і дапамагаюць яны мне".

І сапраўды, калі вы зойдзеце вечарам у памяшканне праўлення калгаса—там поўна людзей. Тут пасля работы збіраюцца брыгадзіры, загадчыкі ферм, члены праўлення, стаханаўцы. Яны мяркуюць, што лепш заўтра рабіць, і як зрабілі сёння. Сярод іх старшыня калгаса—гаспадыня—яна ветліва ўсіх распытвае, яе многія завуць—маці.

— Вось каб мне ранейшае здароўе, не тое-б я яшчэ зрабіла! Але старыцца я не хачу.

Ці можна старыцца, калі былая батрачка Раіна Рыгораўна—зараз член ураду, старшыня перадавога калгаса, лепшая актывістка-грамадчыца.

Як-жа старыцца, калі зямля, лугі, лясы, жывёла—усё гэта тваё!

Калгасны лад вывеў беднякоў і батракоў на светлую дарогу соцыялізма, на шлях заможнага жыцця. Над калгасамі зараз ярка свеціць вялікае сонца сталінскай Канстытуцыі.

Пятроўская,

Уздзенскі раён

Балетны гурток калгаса „Іскра Калектывізацыі".

Дзіцячая самадзейнасць

Паднімаючыся па лесніцы Палаца піянераў, дзеці радасна глядзелі на вялікі партрэт чалавека ў акулярах. Твар з партрэта глядзеў так ветліва і сардэчна, нібы хацеў сказаць: „Калі ласка! заходзьце, любыя дзеткі. Расціце, вучыцеся і жывіце радасна. Краіна любіць і клапоціцца аб вас".

Перад партрэтам дзеці затрымаліся і, не чакаючы падказу экскурсавода, хорам усклікнулі:

— Гікало! Нікалай Фёдаравіч Гікало!.. Гэта ён пабудаваў для нас цудоўны палац...—і дзіцячыя ручкі дружна ўзняліся ў піонерскім салюце.

У фае, каля зала, наладжана выстаўка даіцячых работ. Там вісяць вышыўкі, рысункі, стаяць мадэлі ледакола і іншых прадметаў.

Перад вышытым партрэтам Сталіна з дзяўчынкай на руках стаўпіліся самыя малодшыя ўдзельніцы алімпіяды дзіцячых дамоў і хорам пяюць:

Дзякуй, Сталін дарагі,
За жыццё шчаслівае...

Маша Чэрнік здаровая, поўная дзяўчынка. Яна стаіць каля вышытага ёю дывана і слухае песню малых дзяцей. Ёй успамінаецца мінулае. Яна не памятае бацькоў. З трохгадовага ўзросту выхоўваецца ў Чэрвеньскім дзіцячым доме. Гэта яе сям'я. Усе ўспаміны Машы звязаны з гэтым родным домам. Дзяўчынка расла ў дружным вясёлым калектыве, не ведаючы клопатаў. Яна добра вучылася, не дрэнна грала на мандаліне і з вялікай прыемнасцю займалася мастацкім вышываннем.

Маша жыла весела, але часам яе вялікія шэрыя вочы затуманьваліся сумам, а струны мандаліны гучэлі жалобна. Гэта было тады, калі Маша ўспамінала сваю сястру. Пасля смерці бацькоў адвезлі сясцёр у Чэрвеньскі дзіцячы дом.

У той час абедзве яны, прытуліўшыся адна да другой, паціхеньку плакалі, успамінаючы маму. Потым старшая абнімала сястрычку, суцяшала і ласкала яе. Праз год старшую дзяўчынку перавялі у Менскі дзіцячы дом, і Маша засталася адна. У сэрцы дзяўчынкі жыла моцная любоў да сястры.

Маша глядзела на сваё вышыванне і ўспамінала як часта за гэтай работай яна думала пра сваю любую сястру.

На алімпіядзе Маша прымала ўдзел у струнным аркестры. Яна разам са сваёй групай аглядзела ўвесь палац. Да выступлення заставалася многа часу.

— Маша, пойдзем з намі ў дзіцячае кіно!—пачула яна звонкі голас сваёй таварышкі.

— Хутчэй, хутчэй, Маша!..— падганяла яе ўжо другая.

Дзяўчынка ўсміхнулася, суму як не бывала, і яна пабегла апранаць паліто.

* * *

У фае дзіцячага кіно, каля ўваходу, стаяла маладая жанчына. Яна ветліва загаварвала з дзецьмі, распытвала, як яны жывуць, з якога раёна прыехалі. Дзеці спыняліся, акружалі ласкавую цёцю і гутарылі з ёю. Падыходзілі іх выхавальніцы, і гутарка прымала дзелавы характар, ішоў ужо абмен вопытам.

Гэта была комсамолка Цыля Карпман, нядаўна назначаная дырэктарам Менскага дзіцячага дома № 4.

Ранняе дзяцінства Цылі было поўна жахамі белапольскага тэрора. Совецкая ўлада выхавала яе добрым, карысным чалавекам, і яна горача любіць сваю ўладу. Калі яна, выбраная калектывам, падпісвала пісьмо вялікаму Сталіну ад беларускага народу, яна дала сабе слова прысвеціць сваё жыццё дзецям Совецкай краіны.

—Вось, дзеткі,—звярнулася яна да сабраўшыхся дзяцей,—зараз вам пакажуць карціну, як жывуць дзеці ў краінах капітала. Калі будзеце глядзець — абавязкова параўнайце іх жыццё і сваё, шчаслівае жыццё.

Стаяўшая побач з ёю чатырнаццацігадовая дзяўчынка з матавым тварам паглядзела прамяністымі вачыма на гаварыўшую.

— Цыля Абрамаўна! Я часта ўспамінаю сваю сястрычку. Мне вельмі хацелася пабачыць яе,

На ўсебеларускай алімпіядзе мастацкай самадзейнасці выхаванцаў дзіцячых дамоў БССР. НА ЗДЫМКУ: удзельнікі алімпіяды Галкіна Нюся і Шыхавец Ніна. Фота. Я. Салавейчыка.

пагутарыць з ёю... Але я не турбуюся... Ведаю, дзіцячы дом выхавае яе, як выхаваў мяне і іншых дзяцей.

Цыля абняла дзяўчынку.

— Не трэба сумаваць, Хана. Што ты танцуеш?

— Фізкультурны танец і „Яблычка“.

Група дзяцей праходзілі каля іх. Цыля распытвала іх аб уражаннях дня. Дзеці весела гутарылі. О, зразумела, яны не забудуць Менска! Адна з дзяўчынак падышла бліжэй і ўважліва глядзела сваімі шэрымі вачыма на вясёлую цёцю.

— Маша!!! Мая сястрычка!!!— раптам голасна ўскрыкнула Хана.

У Машы моцна забілася сэрца і, заплакаўшы радаснымі слязмі, яна кінулася ў абдымкі сястры.

Дзяўчынкі цалаваліся і плакалі ад радасці. Абняўшы іх абедзвюх Цыля Абрамаўна паўтарала:

— Вось і сустрэліся, мае дзеткі...

У гэты вечар пад хуткімі пальцамі Машы мандаліна звонка і радасна пела, а балетныя танцы Ханы былі надзвычай грацыёзны. На працягу некалькіх дзён алімпіяды сёстры не адыходзілі адна ад другой.

У алімпіядзе мастацкай самадзейнасці дзіцячых дамоў удзельнічалі дзеці ад 4 да 14 год. Чатырохгадовыя дзеткі калектыўна расказвалі байку „Калабок“. Пратанцавалі і прадэкламавалі „Пары года“. Гэта быў адзін з лепшых нумароў алімпіяды.

Сёстры, седзячы побач, дзяліліся ўражаннямі. Яны былі ў захапленні ад выступленняў дзяцей.

— Паглядзі, Маша, як добра падрыхтаваўся да алімпіяды Мсціслаўскі дашкольны дом,— казала Хана, абнімаючы сястру.

— Вельмі добра! Мне падабаецца...

Ацэнка была правільная. Журы прысудзілі Рэчыцкаму і Мсціслаўскаму дзіцячым дамам першае месца, Магілеўскаму—другое. Гэтыя калектывы далі ў Менску два канцэрты. Іх запрасілі прыехаць у Менск даць канцэрт у дні з'езда Советаў.

Зноў пеніўся паток шчаслівых дзяцей па лесніцах Палаца піонераў. У гэты дзень ад'язджаўшым дзецям была наладжана ёлка.

У дзвярах іх сустракаў „дзедмароз“. У файе віселі „ледзяныя сасулькі“ і ляжаў „пушысты снег“.

Кругом была зіма, хоць на дварэ ішоў дробны халодны дожджык. На сцэне кружыліся ў танцы „пушынкі - сняжынкі“. Яны кружыліся і спявалі. Потым прыбеглі „зайчыкі“, „белачкі“, „медзвяжаткі“. „Дзедмароз“ прынёс ёлку. Прыгожую, ззяючую і вельмі добра прыбраную. А потым прышоў вясёлы новы год.

Дзеці былі бязмежна шчаслівы. Яны падыходзілі да работнікаў Палаца, абнімалі іх і казалі:

— Як добра! Мы ніколі, ніколі не забудзем!

Усюды чуўся радасны смех, шчэбет і вясёлыя воклічы. Чутны былі харавыя выгукі: „Дзякуй роднаму Сталіну за шчаслівае дзяцінства“.

Алмацінская.

На ўсебеларускай алімпіядзе мастацкай самадзейнасці выхаванцаў дзіцячых дамоў. НА ЗДЫМКУ: выхаванцы гомельскага польскага дзіцячага дома выконваюць танец „Матрешка“.

Фото С. Грына і В. Лейна (БСФ).

Сёння сотні сярэдніх, дзесяткі вышэйшых
Навучальных, даследчых у нас устаноў.
Маладосці на свеце няма шчаслівейшай,
Як у нашых шчаслівых дачок і сыноў.

У прасторныя, чыстыя, новыя школы
Яны кожную раніцу дружна ідуць,
Многа іх, белакурых, чарнявых, вясёлых,
Тваё светлае імя ў сэрцах нясуць.

Галасы іх гучаць рознастайнаю мовай:
Тут яўрэі, палякі і латышы,
Тут жыве беларускае, рускае слова,
А пачуцці адзіны ў кожнай душы.

(З пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну)

А. С. ПУШКІН

СТАНЦЫЙНЫ ДАГЛЯДЧЫК

„Коллежский регистратор[1]
Почтовой станции диктатор".
Князь Вяземскі[2]

Хто не праклінаў станцыйных даглядчыкаў, хто з імі не лаяўся? Хто ў хвіліну гневу не патрабаваў ад іх наканаванай кнігі, каб упісаць у яе сваю бескарысную скаргу на ўціск, грубіянства і няспраўнасць? Хто не лічыць іх за катаў чалавечага роду, роўных нябожчыкам пад'ячым[3] або, прынамсі, мурамскім разбойнікам[4]. Будзем, аднак, справядлівымі, пастараемся ўвайсці ў іх становішча і, можа быць, станем разважаць пра іх куды спагадлівей. Што такое станцыйны даглядчык? Шчыры мучанік чатырнаццатага класа, атулены сваім чынам толькі ад пабояў, і то не заўсёды (спасылаюся на сумленне маіх чытачоў).

Якая пасада гэтага дыктатара, як называе яго жартаўліва князь Вяземскі? Ці не сапраўдная катарга? Спакою ні ўдзень, ні ўночы. Усю прыкрасць, назбіраную ў часе нуднай язды, падарожнік спаганяе на даглядчыку. Надвор'е нясцерпнае, дарога дрэнная, фурман упарты, коні не вязуць—а вінен даглядчык. Уваходзячы ў беднае яго памяшканне, праежджы глядзіць на яго, як на ворага; добра, калі ўдасца яму хутка пазбавіцца няпрошанага госця; але калі не трапіцца коней?.. Божа! якая лаянка, якія пагрозы пасылаюцца на яго галаву! У дождж і халепу змушаны ён бегаць па дварах; у буру, у студзеньскі мароз выходзіць ён у сенцы, каб толькі на хвіліну адпачыць ад крыку і штурханняў расцвеленага пастаяльца. Прыяжджае генерал; трасучыся, даглядчык аддае яму дзве апошнія тройкі, у тым ліку кур'ерскую. Генерал едзе, не сказаўшы яму дзякуй. Праз пяць хвілін—званок!.. і фельд'егер[5] кідае яму на стол сваю падарожную!..[6] Удумаемся ва ўсё гэта добра, і, заместа абурэння, сэрца наша напоўніцца шчырым спачуваннем. Яшчэ некалькі слоў: на працягу дваццаці год наўсцяж аб'ездзіў я Расію па ўсіх кірунках; амаль усе поштовыя тракты мне вядомы; некалькі пакаленняў фурманоў мне знаёмы, рэдкага даглядчыка не ведаю я ў твар, з рэдкім не меў я справы; цікавы запас дарожных маіх назіранняў спадзяюся выдаць неўзабаве; пакуль скажу толькі, што станцыйных даглядчыкаў пададзены агульнай думцы ў самым непраўдзівым выглядзе. Гэтыя так ашальмованыя даглядчыкі наогул людзі ціхамірныя, ад прыроды ўслужныя, схільныя ўжывацца з людзьмі, сціплыя ў дамаганнях на пашану і не надта срэбралюбныя. З іх гутарак (якімі недарэчы грэбуюць паны праяжджаючыя) можна вынесці шмат цікаўнага і павучальнага. Што датычыцца мяне, дык прызнаюся, я ўважаю за лепшае іх гутарку, як размовы якога-небудзь чыноўніка 6-га класа, які ездзіць па казённай патрэбе.

Лёгка можна здагадацца, што ёсць у мяне прыяцелі з шаноўнага стану даглядчыкаў. Сапраўды, памяць аднаго з іх мне дорога. Акалічнасці некалі зблізілі нас, і аб ім вось маю намер я цяпер пагутарыць з дарагімі чытачамі.

У 1816 годзе, у маі месяцы, здарылася мне праяжджаць праз ***скую губерню, трактам, цяпер знішчаным. Быў я ў дробным чыне, ехаў на перакладных і плаціў прагоны[7] за два кані. З прычыны гэтага даглядчыкі са мною не цырамоніліся, і часта браў я з бою тое, што, на маю думку, належыла мне па праву. Будучы маладым і запальчывым, я абураўся на подласць і маладушнасць даглядчыка, калі гэты апошні аддаваў прырыхтаваную мне тройку пад каляску чыноўнага пана. Гэтак-жа доўга не мог я прывыкнуць і да таго, што разборлівы халоп мінаў мяне страваю на губернатарскім абедзе. Зараз тое і другое здаецца мне ў парадку рэчаў. Сапраўды, што было-б з намі, калі-б заместа агульнавыгоднага правіла: *чын чына паважай*, увялося ва ўжытак другое, напрыклад: *розум розума паважай*? Якія ўзніклі-б спрэчкі! і слугі з каго-б пачыналі яду падаваць? Але звараchаюся да маёй аповесці.

Дзень быў гарачы. За тры вярсты ад станцыі*** пачало накрапваць, і праз хвіліну заліўны дождж змачыў мяне да апошняй ніткі. Пасля прыезду на станцыю першая турбота была як хутчэй пераадзецца, другая—спытацца сабе чаю. „Гэй, Дуня!—закрычаў даглядчык,—пастаў самавар, ды схадзі па смятану". Пры гэтых словах вышла з-за пераборкі дзяўчынка гадоў чатырнаццаці і пабегла ў сенцы. Прыгажосць яе мяне здзівіла.

— Гэта твая дачка?—спытаўся я ў даглядчыка.

— Дачка-с,—адказаў ён з выглядам ганарлівага задавальнення;—ды такая разумная, такая рухавая, уся ў нябожчыцу маці.—Тут ён узяўся перапісваць маю падарожную, а я заняўся разглядваннем малюнкаў, якія ўпрыгожвалі яго сціплае, але чыстае мяшканне. Была там гісторыя блуднага сына: на першым малюнку паважны старык у калпаку і шлафроку адпускае непакойлівага юнака, які спешна прымае яго блаславенне і мяшок з грашыма. На другім яркімі рысамі пададзены распусныя паводзіны маладога чалавека: ён сядзіць за сталом, абкружаны аблуднымі сябрамі і бессаромнымі жанчынамі. Далей прамантачыўшыся юнак у рыззі і трохраговым капелюшы пасе свіней і разам з імі есць; на яго твары адбіты глыбокі смутак і каянне. Нарэшце пададзены зварот яго да бацькі; добры стары ў тым-жа калпаку і шлафроку выбягае да яго насустрач; блудны сын стаіць на каленях; у перспектыве повар забівае сытае цяля, і старэйшы брат пытаецца ў слуг аб прычыне такой радасці. Пад кожным малюнкам

---

[1] Калежскі рэгістратар—ніжэйшы цывільны чын у царскай Расіі.

[2] П. А. Вяземск (1792—1878)—вядомы паэт, сучаснік і друг Пушкіна.

[3] Пад'ячы—судзейскі пісец. Пад'ячыя былі вядомы сваім кручкатворствам і хабарніцтвам.

[4] Мурамскія лясы—па правым беразе Окі, вядомыя ў даўнейшыя часы сваімі разбойнікамі.

[5] Фельд'егер—ваенны кур'ер для перадачы асабліва важных даручэнняў.

[6] Падарожная—папера, якая давала права на атрыманне паштовых коней.

[7] На перакладных—на казённых конях, якія мяняліся на паштовых станцыях. Прагоны—праяздныя грошы, якія плаціліся з разліку за кожнага каня і вярсту.

прачытаў я прыстойныя нямецкія вершы. Усё гэта дасюль захавалася ў маёй памяці, гэтакжа як і гаршкі з бальзамінам і ложак з пярэстаю занавескаю, і іншыя прадметы, якія мяне ў той час абкружалі. Бачу, як цяпер, самога гаспадара, чалавека гадоў пяцьдзесят, свежага і бадзёрага, і яго даўгі зялёны сурдут з трыма медалямі на палінялых лентах.

Не паспеў я расплаціцца з старым маім фурманом, як Дуня вярнулася з самаварам. Маленькая какетка з другога погляду заўважыла ўражанне, зробленае ёю на мяне; яна апусціла вялікія блакітныя вочы; я пачаў з ёю гутарыць, яна адказвала мне без усякай нясмеласці, як дзяўчына, якая бачыла свет. Я прапанаваў бацьку яе шклянку пуншу; Дуні падаў я кубачак чаю, і мы ў траіх пачалі гутарыць, як быццам век былі знаёмыя.

Коні былі даўно гатовы, а мне ўсё не хацелася растацца з даглядчыкам і яго дачкой. Нарэшце я з імі развітаўся; бацька пажадаў мне добрай дарогі, а дачка праводзіла да фурманкі. У сенцах я спыніўся і прасіў у яе дазволу яе пацалаваць: Дуня згадзілася... Шмат я магу налічыць пацалункаў,

„С тех, как этим занимаюсь",

але ні адзін не пакінуў ва мне такога доўгага, такога прыемнага ўспаміну.

Прайшло некалькі год, і акалічнасці прывялі мяне на той самы тракт, у тыя самыя месцы. Я ўспомніў дачку старога даглядчыка і ўзрадваўся пры думцы, што ўбачу яе зноў. Але, падумаў я, стары даглядчык, можа быць ужо зменены; напэўна Дуня ўжо замужам. Думка аб смерці таго або другога таксама мільгнула ў галаве маёй, і я набліжаўся да станцыі*** з сумным прадчуваннем. Коні сталі каля паштовага дамка. Увайшоўшы ў пакой, я зараз-жа пазнаў малюнкі, якія паказвалі гісторыю блуднага сына; стол і ложак стаялі на ранейшых месцах; але на вокнах ужо не было кветак і ўсё кругом сведчыла аб старасці і нядбальстве. Даглядчык спаў пад кажухом; мой прыезд разбудзіў яго, ён прыўстаў... Гэта быў сапраўды Сімеон Вырын; але як ён пастарэў! Пакуль збіраўся ён перапісаць маю падарожную, я глядзеў на яго сівізну, на глыбокія маршчыны даўно нябрытага твара, на згорбленую спіну—і не мог надзівіцца, як тры або чатыры гады маглі ператварыць бадзёрага мужчыну ў хілага дзеда.

— Ці пазнаў ты мяне?—спытаўся я ў яго;—мы з табою старыя знаёмыя.

— Можа здарыцца,— адказаў ён панура;—тут дарога вялікая; шмат праезджых у мяне перабывала.

— Ці здарова твая Дуня?—не спыняўся я. Стары нахмурыўся.

— А бог яе ведае,—адказаў ён.

— Дык відаць яна замужам?—сказаў я.

Стары прыкінуўся быццам не чуў майго запытання і шопатам чытаў маю падарожную. Я спыніў свае запытанні і загадаў паставіць чайнік. Цікаўлівасць пачынала мяне непакоіць, і я спадзяваўся, што пунш развяжа язык майго старога знаёмца.

Я не памыліўся: стары не адмовіўся ад прапанаванай шклянкі. Я заўважыў, што ром праясніў яго панурасць. Ад другой шклянкі зрабіўся ён гаваркі; успомніў, або паказаў выгляд, быццам успомніў мяне, і я ўведаў ад яго аповесць, якая ў той час дужа мяне зацікавіла і кранула.

„Дык вы ведалі маю Дуню?—пачаў ён.—Хто-ж і не ведаў яе? Ах, Дуня, Дуня! Што гэта за дзеўка была! Бывала, хто ні праедзе, усякі пахваліць, ніхто не дасць ганьбы. Пані абдорвалі яе, тая хусцінкаю, тая завушніцкамі. Паны праезджыя наўмысля спыняліся, быццам паабедаць, ці павячэраць, а на праўду толькі, каб на яе болей паглядзець. Бывала пан, які-б сярдзіты не быў, пры ёй сціхае і міласліва са мною гутарыць. Ці паверыце, васпан: кур'еры, фельд'егеры з ёю па поўгадзіны загаворваліся. Ёю дом трымаўся; што прыбраць, што прыгатаваць, за ўсім паспявала. А я, стары дурань, не нагляджуся, бывала не нарадуюся; ужо ці я не любіў маёй Дуні, ці я не песціў маё дзіця; ужо ці ёй не было жыццё? Ды не, ад бяды не адбажыцца; што суджана, таму не мінуць.—Тут ён стаў падрабязна расказваць мне сваё гора:—Тры гады таму назад, аднойчы, зімнім вечарам, калі даглядчык разліноўваў новую кнігу і дачка яго за пераборкаю шыла сабе плацце, тройка пад'ехала, і праезджы ў чаркескай шапцы, у ваенным шынялі, абхутаны шалікам, увайшоў у пакой, патрабуючы коней. Коні ўсе былі ў разгоне. Пры гэтай вестцы падарожны ўзвысіў быў голас і плётку; але Дуня, звыклая да гэтых сцэн, выбегла з-за пераборкі і ласкава звярнулася да праезджага з пытаннем: ці не будзе мець ён жаданне чаго-небудзь паесці? З'яўленне Дуні зрабіла як за звычай сваё ўражанне. Гнеў праезджага прайшоў; ён згадзіўся чакаць коней і заказаў сабе вячэру. Зняўшы мокрую калматую шапку, адкруціўшы шалік і скінуўшы шынель, праезджы аказаўся маладым, стройным гусарам з чорнымі вусікамі. Ён размясціўся ў даглядчыка, пачаў весела гутарыць з ім і з яго дачкою. Падалі вячэраць. Між тым коні прышлі, і даглядчык загадаў, каб запража, не кормячы, запрагалі іх у кібітку праезджага; але вярнуўшыся, знайшоў ён маладога чалавека амаль без памяці ляжачага на лаўцы: яму зрабілася дрэнна, галава разбалелася, не магчыма было ехаць... Як быць? даглядчык пераступіў яму свой ложак і вырашана было, калі хвораму не будзе лягчэй, на другі дзень раніцай паслаць у С*** па лекара.

(Працяг у наступным нумары).

ЦАНА 20 кап.

08



Мастак Сімбірын малюе партрэт А. С. Пушкіна.

Адказны рэдактар М. І. ВОЛГІНА

Адрас рэдакцыі: Менск, Дом друку, 3-ці паверх, пакой 60. Тэл. 24-118.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 63, Тыраж 6 Галоўлітбел № 1933
Здана ў набор 16/I—37 г Падпісана да друку 29/I—37 г. 2½ арк. 120.140 друк. знакаў